не разглядалася і вынікаў ніякіх не было. Лістом напішу падрабязьней. Цалую Вас, Анечка, Лорачка, Лялячка, моцна.

Ваш *Адам*.

Ці цёпла ў Вас у хаце? У нас сёньня раніцою было 7° па Цэльсію. От табе й кватэра з апалам і ўсімі паслугамі. Думаем апытаць дзе другі пакой, бо нашы гаворкі ня вельмі прабіраюць гаспадыню. Прывітаньне ад Антося. Лоры ліст напішу асобна.

*Адам*.

## № 80. Ганьне Бабарэцы

*22 сьнежня 1934 г.*

Дарагая і любая Анечка!

Думаў я, удасца наведацца к Вам гэтымі днямі. Ажно нічога дагэтуль не атрымаў на сваю заяву. Усе кажуць, што няма начальства новага. Штодзень заходжу, даведваюся. Але ўсё–ж надзеі яшчэ ня страціў. Падаў другую ўжо заяву. Ды думаю падаць яшчэ й трэцюю, каб дазволілі зусім пераехаць у Слабадзкі. Так, ведаеш, дадзела і работа, і жыцьцё гэткае, што, здаецца–б, не глядзеў на ўсё гэта. Хацеў кінуць работу ды пробаваць шукаць пэдагогічнай, дык у зьвязку з краёвымі зьменамі надзеі знайсьці пэдагогічную працу паменшыліся. Наконт крайгорту яшчэ таксама нічога не вядома. Пішы, Анечка, як жывеш і як маюцца дзеці. Моцна цалую Вас усіх. Прывет Вам ад Антося.

Ваш *Адзік*.

## № 81. Ганьне Бабарэцы

*28 сьнежня 1934 г.*

Любая Анечка!

Ты мо' надумала наведаць мяне 30 ці 1, дык мяне гэтымі днямі не застанеш. Буду ў Зуеўцы ці Фалёнках праводзіць інвэнтарызацыю ў гортаўскіх магазынах. Вярнуся 2 студзеня. З маіх заяў няма ніякіх скуткаў. Ось хіба толькі пасьля гадавой справаздачы атрымаю службовую камандыроўку, дык тады наведаю Вас. Алесь перадаваў, што ты ўжо працуеш у Ціміразеўцы. Гэта добра. Але, мусіць, паменшылася ў цябе на шмат гадзін. Думаў я пераслаць поштаю электрычную апаратуру, дый не паслаў. Мо' будзе хто ад Вас гэтымі днямі, дык перадам, а калі не — дык сама забярэш, як будзеш тут. Няхай не сярдуюць Лорачка і Лялячка, што ім лістоў не пісаў. Праўду кажучы, цяпер заняты цэлымі днямі. Цалую Вас моцна.

Ваш *Адзік*.